*Новыя выданні*

Вольга РУСІЛКА,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

# БЕЛАРУСКІ РАМАН У СУЧАСНЫМ КАНЦЭПТУАЛЬНЫМ АСЭНСАВАННІ

**Навасельцава, Г. В.** Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя : манаграфія / Г. В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2020. – 268 с.

Ёсць працы, актуальнасць і практычную значнасць якіх асабліва і даводзіць не патрэбна: яны вынікаюць ужо з назвы. Да такіх адносіцца манаграфія "Жанр рамана ў беларускай літаратуры другой паловы XX – пачатку XXI стагоддзя" Ганны Навасельцавай. Маючы прамое дачыненне да школьнай практыкі выкладання літаратуры, добра ведаю, як чакаюць настаўнікі новага погляду на сучасную беларускую прозу, не абмяжоўваючы яе пачаткам 1990-х гг. (зазначым, што большасць метадычных выданняў для школ на гэтыя межы і накіроўвае). Тым больш што кніга Г. Навасельцавай – не проста агляд, а канцэптуальнае даследаванне вытокаў і шляхоў развіцця сучаснага беларускага рамана, прычын і наступстваў тых працэсаў, што адбываліся ў айчынным прыгожым пісьменстве, і сённяшняй надзвычай багатай жанравай палітры прозы. Дадатковую вельмі прывабную падсветку працы надае той факт, што яе аўтар – не толькі дактарант, але і вядомая пісьменніца, якая піша ў арыгінальным жанры фэнтэзі і літаратурнай казкі і сама актыўна стварае сучасны літаратурны працэс. І гэта не выпадковасць, а заканамернасць. Адметнасцю беларускай літаратуры ўжо даўно стаў той факт, што выдатныя прадстаўнікі літаратуразнаўчай навукі годна выяўляюць сябе ў мастацкай творчасці і наадварот. Можна сказаць, што гэта павышае кампетэнцыі аўтара ў кожнай з абраных галін дзейнасці.

Манаграфія Г. Навасельцавай мае выверaную і лагічную структуру, кожны кампанент якой прадуманы, выключна змястоўны і заканчваецца лагічным падагульненнем: уводзіны, пяць раздзелаў, заключэнне. Унушальны спіс выкарыстанай літаратуры з 313 адзінак завяршае працу. Ва ўводзінах, спасылаючыся на выказванні як прызнаных літаратуразнаўцаў М. Бахціна, Л. Андрэева, Г. Паспелава, Н. Тамарчанкі, так і "модных" пісьменнікаў Міларада Павіча і Мілана Кундэры, даследчыца даводзіць неабходнасць прадуманай унутрыжанравай класіфікацыі рамана і выпрацоўкі агульных тыпалагічных падыходаў да вывучэння жанру, а таксама цэласнага аналізу дынамікі рамана ў беларускай літаратуры. Адразу ж заяўляецца мэтазгоднасць выкарыстання паняццяў "тыповая змястоўная форма" і "актуальная жанравая мадэль", асноўныя эстэтычныя характарыстыкі якіх будуць удакладняцца ў ходзе далейшага даследавання. Такі пачатак дапамагае ўяўляць перспектывы навуковай працы.

Першы раздзел "Жанр рамана ў літаратуразнаўстве" складаецца з дзвюх частак: "Раман як змястоўная форма" і "Вывучэнне рамана: гісторыя і сучаснасць". Чытач з цікавасцю пазнаёміцца з рознымі азначэннямі рамана, выбера для сябе блізкую, даведаецца пра яго шматлікія жанравыя разнавіднасці (класічны і некласічны, раман-эпапея, навелістычны, аўтабіяграфічны, раман-партрэт, раман-успамін і інш.). Пры ўсёй прадвызначанасці ў манаграфіі тэарэтычнага раздзела пра вывучанасць праблемы ў сучасным літаратуразнаўстве цікава пазнаёміцца з рознымі падыходамі да тыпалогіі жанру рамана, тым больш што Г. Навасельцава сабрала поўную карціну гісторыі даследавання праблемы і трапныя цытаты з класікаў сусветнага літаратуразнаўства, што само па сабе каштоўна.

Пасля глыбокага і змястоўнага экскурсу ў гісторыю вывучэння раманнага жанру Г. Навасельцава лагічна выбірае зручны для даследавання дынамікі літаратурнага працэсу храналагічны прынцып. Другі раздзел мае назву "Беларускі раман 1945–1965 гадоў" і складаецца з двух падраздзелаў: "Раман пра Вялікую Айчынную вайну: ускладненне тэматыкі і праблематыкі" і «"Вытворчы" раман у працэсах унутрыжанравай трансфармацыі». Здавалася б, пра добра вядомыя са школьнай праграмы творы цяжка сказаць нешта новае, аднак даследчыца знаходзіць цікавыя ракурсы размовы, супастаўляючы шматгеройны і аднагеройны раман пра Вялікую Айчынную вайну і робячы на прыкладзе твораў І. Навуменкі, А. Адамовіча, Я. Брыля выснову пра плённасць і перспектыўнасць новага эстэтычнага ўзору (аднагеройнага рамана) для беларускай літаратуры. Разважаючы пра "вытворчыя" раманы У. Карпава, Т. Хадкевіча, І. Пташні-

кава, П. Пестрака і іншых, Г. Навасельцава крыху нечакана пераходзіць да мележаўскай "Палескай хронікі", хоць сама абгрунтаваная ацэнка твора як новага ўзору шматгеройнага рамана з паглыбленай увагай да канкрэтнай асобы і яго выключнай ролі ў развіцці айчыннай літаратуры сумненняў не выклікае. Дарэчы ўспомніць, што і сам І. Мележ адказна ставіўся да магчымасцяў раманнага жанру: "Раман – артылерыя. Нельга з пушкі па вераб'ях. Раман – менш аператыўны, затое – больш вясомы. Раману – шырокае поле, важныя праблемы, абагульненні"*. Творы І. Мележа, як зазначае даследчыца, многія аўтары разглядалі як мастацкія ўзоры для пераймання (дадамо, што разглядаюць і сёння).

Трэці раздзел "Беларускі раман 1966– 1985 гадоў" паглыбляе нас у эстэтычныя праблемы развіцця жанру. Першы падраздзел "Мастацкая інтэрпрэтацыя аўтарскай сучаснасці ў беларускім рамане" цікавы перш за ўсё глыбокай і арыгінальнай ацэнкай раманаў У. Караткевіча ў кантэксце тагачаснай прозы (І. Шамякін, І. Пташнікаў, А. Асіпенка). Нават з улікам дзясяткаў кніг, напісаных пра У. Караткевіча дактарамі навук, высновы маладой даследчыцы вылучаюцца значнасцю і навізной: «*Адметнасцю творчай манеры пачынальніка гістарычнай прозы выступае паказ "перакрыжавання" розных тэмпаральных адрэзкаў мінулага, мінулага і аўтарскай сучаснасці, дзейнымі асобамі якіх выступаюць скразныя вобразы, увасабленне гістарычнай спадчыны ў шырокім культурна-грамадскім кантэксце*» (с. 131). Другі падраздзел гэтай часткі манаграфіі "Наватарскія інтэрпрэтацыйныя акцэнты ў рамане пра вайну" прысвечаны аналізу твораў І. Навуменкі, В. Быкава, І. Пташнікава, П. Місько, А. Марціновіча, М. Аўрамчыка, на аснове чаго робіцца абгрунтаваны вывад аб працэсе лірызацыі змястоўнай формы ў ваенным рамане. Як выснова гучыць назва трэцяга падраздзела: "Поліпраблемнасць як эстэтычная норма беларускага рамана". Асноўную ўвагу даследчыца аддае такому паказальнаму эстэтычнаму напрамку развіцця поліпраблемнага рамана, як асэнсаванне прыродазнаўчай праблематыкі ў складаным аксіялагічным кантэксце (творы В. Казько, В. Карамазава, Б. Сачанкі).

Чацвёрты раздзел "Беларускі раман 1986–2000-х гадоў" у якасці асноўнай сцвярджае ідэю далейшага ўзмацнення лірызацыі змястоўнай формы, звязанай са зваротам пісьменнікаў да мастацкага даследавання асобы. Назвы двух падраздзелаў пераклікаюцца з гэтай ідэяй: «Генезіс і дынаміка "Я"-рамана», «"Я"-апавядальная стратэгія ў шматгеройным рамане, раманнай серыі». Спасылаючыся на ідэі вядомага практыка і тэарэтыка нелінейнага мастацкага апавядання М. Павіча пра неабходнасць актыўнага ўключэння чытача ў працэс сутворчасці, Г. Навасельцава аналізуе творы У. Рубанава і С. Яновіча, заўважаючы ў іх плённую для традыцыйнай беларускай прозы тэндэнцыю да інтэрактыўнасці праз пошук чытачом сэнсавых варыянтаў. Як выяўленне неабмежаваных магчымасцяў "я"-апавядальнай стратэгіі разглядаюцца раманы "Рэвізія" А. Федарэнкі, "Лабірынты страху" А. Асіпенкі, "Цень крумкачовага крыла" А. Марціновіча, "Кентаўры" В. Гігевіча і інш. На аснове канцэптуальнага аналізу шматгеройных раманаў і раманных серый ("Меч князя Вячкі", "След ваўкалака", "Жалезныя жалуды" Л. Дайнекі, "Уладары ВКЛ" В. Іпатавай, "Явар з калінаю", "Арляк і зязюля", "Хмель каля вольхі" М. Кусянкова) даследчыца выяўляе сінтэз прамога і непрамога адлюстравання рэчаіснасці пры ўвазе да духоўнага свету асобы і істотным паслабленні падзейнасці.

Безумоўна, большасць чытачоў манаграфіі праявіць асаблівую зацікаўленасць пятым раздзелам "Сучасны беларускі раман". Невыпадкова ён вылучаецца большым аб'ёмам і большай дэталізацыяй на падраздзелы, назвы якіх хочацца агучыць, каб падкрэсліць глыбіню, логіку і сучаснасць даследчыцкай думкі: "Мастацкае развіццё класічнай раманнай формы", "Жанравыя разнавіднасці сучаснага беларускага рамана", "Навелістычная арганізацыя рамана", "Інтэграцыя жанраў у сучасным беларускім рамане".

Значныя эстэтычныя магчымасці традыцыйнай сямейна-бытавой хронікі Г. Навасельцава пераканальна паказвае на прыкладзе раманаў "Уліс з Прускі", "Расія", "Вяртанне", "Валошкі на мяжы", "Вайна", "Пасля вайны" У. Гніламёдава і трылогіі "Пакутны век" В. Якавенкі, дзе адлюстравана жыццё беларускага селяніна ў кантэксце гістарычнай эпохі. У межах класічнай раманнай формы магчымы актыўныя мастацкія пошукі і эксперыменты, пра што сведчаць творы "Золата забытых магіл", "Скокі смерці", "Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію", "Сутарэнні Ромула", раманны цыкл "Авантуры Пранціша Вырвіча, шкаляра і шпега", "Авантуры студыёзуса Вырвіча", "Авантуры драгуна Пранціша Вырвіча", "Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата" Л. Рублеўскай. Як пераканальна паказвае Г. Навасельцава, пяру Л. Рублеўскай падуладны і дэтэктыўны, і авантурны, і паралельны раман, і раман-выхаванне, і своеасаблівы мастацкі сінтэз гістарычнага, прыгодніцкага, фантасмагарычнага зместу.

* **Мележ, І.** Збор твораў : у 10 т. / І. Мележ. – Мінск : Маст. літ., 1979–1984. – Т. 9, кн. 1. – Мінск, 1984. – С. 279.

Вызначаючы жанравыя разнавіднасці сучаснага беларускага рамана, даследчыца слушна заўважае, што вынікам наватарскага асэнсавання класічнай формы з'яўляюцца раман-фантасмагорыя, раман-антыўтопія, філасофскі раман, дае глыбокія і дакладныя фармулёўкі такіх жанравых форм і пацвярджае тэарэтычныя разважанні канкрэтным аналізам рамана-фантасмагоры «Ліст у галактыку "Млечны шлях"» Ю. Станкевіча і яго рамана-антыўтопіі "П'яўка", філасофскіх раманаў "Палыновы вецер" Л. Леванoвіча і "На мяжы цярпення" У. Дамашэвіча і іншых арыгінальных твораў. Зацікавяць чытача думкі пра мастацкую прагностыку антыўтопіі, якая дае карціны будучага грамадства, палярную сістэму персанажаў і паглыбленне трагізму асобы ў найноўшых прыкладах жанру. Лагічным выглядае зварот да эксперыментальнай дэтэктыўнай прозы Л. Рублеўскай, якая творча працягвае традыцыі У Караткевіча і ідзе адметным шляхам: «*Правакацыя ў рэчышчы постмадэрнісцкай эстэтыкі, устаноўка на займальнасць выяўляюць адметнасць дэтэктыўнага рамана "Золата забытых магіл"*» (с. 205). Гэтак жа трапна адзначае Г. Навасельцава караткевічаўскія традыцыі ў раманах "Літоўскі воўк" А. Наварыча, "Імя грушы" С. Балахонава, "Рыбін горад" Н. Бабінай, "Ноч цмока" В. Гапеева, "Чорны кот" В. Казакова.

Разважаючы пра актуальную для сучаснай прозы навелістычную арганізацыю рамана і звязваючы яе з выяўленнем аўтарскага "я", даследчыца глыбока аналізуе раман-містыфікацыю "Зубарэвіцкая сага" Я. Сіпакова, раманы "Дом" А. Глобуса, "Замак, пабудаваны з крапівы" З. Вішнёва. Як вынік актыўнай інтэграцыі жанраў асэнсоўваюцца раманы-эсэ А. Лойкі і А. Федарэнкі, раман-споведзь "Пісьмо ў Рай" А. Савіцкага, раман-біяграфія "Круг" А. Пашкевіча, раман-жыцце "Пакліканыя" В. Коўтун і інш.

Напрыканцы рэцэнзіі дазволю сабе рэмарку, непасрэдна звернутую да чытача. Калі вы думаеце, што я назвала замнога прозвішчаў і твораў, то паверце, гэта меней за палову таго, што ёсць у кнізе Г. Навасельцавай. У мяне склалася ўражанне, што яна прааналізавала **ўсё**, што мае дачыненне да беларускага рамана. А ў "Заключэнні" зрабіла грунтоўныя і глыбокія высновы, якія хочацца цытаваць: «*У сучасным беларускім рамане змястоўная форма творча развіваецца дзякуючы пісьменніцкай арыентацыі на класічны традыцыйны ўзор, дзе паўнавартасна ўвасабляецца нацыянальна адметны характар беларуса. Актуальная мадэль раскрываецца праз узнаўленне жанравага канону авантурнага рамана і рамана выхавання, "дэтэктыўнай" трансфармацыі жанру, праз выкарыстанне эстэтычных магчымасцяў "малой" прозы, праз аўтарскае запазычанне арыгінальнай стылёвай формы*» (с. 250). Аднак спыніцца трэба, хоць бы для таго, каб пакінуць чытачу асалоду сустрэчы з разумнай кнігай, якая абавязкова прынясе адкрыцці і зробіць кожнага больш дасведчаным у разуменні сучаснага літаратурнага працэсу.